

КУЛЬТУРА СЯЛА — ПАНЯЦЦЕ ЕМІСТАЕ

# Дзейсная дапамога

Адзін з аспектаў работы кожнай сельскай бібліятэкі— прапаганда дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, перадавога вопыту. Гэта добра разумее загадчыца Лугаваслабадской сельскай бібліятэкі Л. І. Андросік. Яна падрыхтавала спецыяльную кніжную выстаўку «Перадавы вопыт сельскай гаспадаркі — здабытак кожнага». Тут прадстаўлены выданні па агратэхніцы, розныя дапаможнікі і даведнікі па новых сельгасмашынах. Да паслуг чытачоў картатэка па сельскагаспадарчай літаратуры, дзякуючы якой можна лёгка адшукаць патрэбную кнігу ці брашуру. Укамплектаваны і функцыяніруюць дзве перасоўныя бібліятэчкі ў аддаленых вёсках Дварэц і Забалацце. Выпісаны спецыяльныя часопісы «Навукова-тэхнічная інфармацыя па сельскай гаспадарцы», «Сельская гаспадарка Беларусі і іншыя, складзены тэматычныя папкі, якія папаўняюцца выразкамі з газет і часопісаў.

Работа бібліятэкара не дарэмная: у чытальнай зале заўсёды чутны зацікаўленыя галасы механізатараў і іншых працаўнікоў саўгаса «Волма», Заходняй машынавыпрабавальнай станцыі і г. д. У апошнія дні трактарыст Уладзімір Мікалаевіч Канавалаў узяў «Каталог дэталяў», «Дапаможнік слесара», «Даведнік сельскагаспадарчых машын», механізатар Адам Кірылавіч Тоўсцік — «Рамонт аўтатрактара», шафёр Аляксандр Сцяпанавіч Караткі—«Пытанні сельскагаспадарчай тэхнікі» і г. д. Усе яны дзякуюць бібліятэкару за дзейсную дапамогу.

А. КУБАРЧЫК.



Любимым местом отдыха тружеников совхоза «Волма» Минского района стал Дом культуры на центральной усадьбе хозяйства в деревне Логова Слобода.

На снимках: 1. Около семи тысяч книг предлагает своим читателям библиотека при Доме культуры;

Фото К. Януловича.



Л. І. Алешачкіна /Андросік/ — загадчыца бібліятэкі /Лугаваслабадская СБ/ «Сельская газета» 6.II.1979 г.